# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Планы-канспекты ўрокаў

1 клас

*Дапаможнік для педагогаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі*

М а з ы р
«Выснова»
2 0 2 0

# Прадмова

Распрацоўкі ўрокаў складзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай і прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем. Прапанаваны матэрыял падпарадкаваны тэме ўрока і аб'яднаны тэматыкай вывучаемай лексічнай групы.

У зборніку адлюстраваны прыёмы, накіраваныя на практычнае выкарыстанне вывучаных слоў у разнастайнай, цікавай і даступнай форме, прапануюцца заданні з выкарыстаннем загадак, вершаў, скорагаворак, гульняў і інш. Загадкі, падабраныя ў цеснай сувязі са зместам урока, накіраваны на ўзбагачэнне лексікі, развіццё ўвагі да слова, выпрацоўку назіральнасці і кемлівасці вучняў. Прапанаваныя вершы будуць развіваць маўленчы слых і памяць вучняў, садзейнічаць засваенню новай лексікі. Скорагаворкі, падабраныя ў адпаведнасці з канкрэтным фанетыка-арфаэпічным матэрыялам, дапамогуць сфарміраваць у вучняў першапачатковыя вымаўленчыя навыкі. Улічваючы той факт, што вымаўленне многіх гукаў у рускай і беларускай мовах рознае, асаблівая ўвага надаецца практыкаванням па адпрацоўцы гукаў [г], [дз'], [дж], [ў], [р], [ч], [ц'], спалучэння [шч]. У выданні прапануюцца разнастайныя формы работы, якія дапамогуць вучням запамінаць словы, з цікавасцю вывучаць мову.

Выданне адрасавана настаўнікам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання, якія працуюць у 1 класе.

# Раздзел I
# Вучымся слухаць і вымаўляць

## УРОК 1

## Наша мова

**Мэты:**
- пазнаёміць вучняў з падручнікам, сімваламі Беларусі;
- вучыць адрозніваць на слых рускае і беларускае маўленне, фіксаваць словы, гучанне якіх адрозніваецца ў рускай мове;
- садзейнічаць развіццю маўленчага слыху, зацікаўленасці да вывучэння беларускай мовы.

**Абсталяванне:** падручнік, карткі, каляровыя алоўкі, дэманстрацыйны малюнак «Дзень добры, школа!», карта Беларусі.

### Ход урока

**1. Арганізацыйны момант**

— Сёння ў нас незвычайны ўрок. Мы пачынаем вывучаць беларускую мову. Гэта родная мова беларусаў.

— Паслухайце верш:

У школу я ўжо хаджу.
За партай ціхенька сяджу.
Буду добра я вучыцца,
А бацькі мной — ганарыцца.

— На якой мове слухалі верш? Ці зразумелі сэнс? Руская і беларуская мовы падобныя, у іх шмат агульных слоў.

*Настаўнік тлумачыць незразумелыя словы.*

Завучванне тэксту і прагаворванне хорам.

**2. Падрыхтоўка да ўспрымання тэмы**

**2.1.** Слуханне музыкі.

*Гучыць музыка «Край мой, беларускі край» (А. В. Багатыроў, кантата «Беларускія песні».)*

— Якія народныя музычныя інструменты вы пачулі? Знайдзіце іх на малюнках. (*Цымбалы, гармонік, трашчоткі, лыжкі, свістулькі, бубен.)*

*Настаўнік паказвае малюнкі, вучні называюць інструмент. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на прыгажосць музыкі, яе непаўторнасць, знаёміць з сімваламі Беларусі, звяртаецца да вокладкі падручніка.* [22]



— Як называецца прадмет, які мы будзем вывучаць? (*Дзеці спрабуюць прачытаць назву падручніка. Калі такіх вучняў няма, чытае настаўнік.)*

— Скажыце, а чаму трэба вывучаць беларускую мову? Ці важна ведаць і размаўляць на ёй? Чаму? Здагадайцеся, чаму ў 1 класе ёсць такі прадмет? А ці вывучаюць яго ў старэйшых класах?

*Настаўнік слухае выказванні вучняў і абагульняе.*

— Разгледзьце малюнкі. На якім малюнку паказаны беларусы? Як здагадаліся? На якой мове размаўляюць беларусы? [27]



**2.2.** Работа над прыказкамі.

— Усяму пачатак — родная мова. У беларусаў кажуць: «Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў».

*Настаўнік падводзіць вучняў да думкі, што трэба любіць, берагчы мову продкаў і ганарыцца сваім паходжаннем. Звяртае ўвагу на карту Беларусі, яе межы і паказвае сталіцу.*

— Вывучаць беларускую мову нам дапаможа падручнік.

*Вучні паўтараюць слова «падручнік», знаёмяцца з правіламі карыстання, умоўнымі абазначэннямі, зместам падручніка (с. 2, 3).*

**3. Знаёмства з тэмай урока. Пастаноўка мэты ўрока**

— Як вы лічыце, аб чым пойдзе гутарка на ўроку? Якая галоўная мэта ўрока? *(Вучні разам з настаўнікам вучацца фармуляваць мэту.)*

*(Пачаць знаёмства з беларускай мовай, яе слоўнікам.)*

— Таму трэба быць уважлівымі, разумнымі, актыўнымі...

*Настаўнік разам з вучнямі падбірае патрэбныя словы, тлумачыць іх сэнс і важнасць.*

**4. Новы матэрыял**

**4.1.** Работа па падручніку (с. 4).

— Куды прыйшлі маці з хлопчыкам? *(На кніжную выставу.)* Кнігі на якой мове яны ўбачылі?

— На якой мове гавораць рускія людзі? На якой мове гавораць украінцы? На якой мове гавораць палякі? На якой мове гавораць беларусы?

— Чаму існуюць кнігі на розных мовах?

— Як вы думаеце, што сказала матуля хлопчыку? *(На зямлі жыве шмат народаў. Кожны павінен ведаць родную мову.)*

***Фізкультхвілінка***

*Выконваецца пад песню А. Е. Елісеенкі — Г. Сінякова «Я люблю Беларусь».*

**4.2.** Чытанне верша настаўнікам, аналіз.

— Паслухайце верш «Міколкавы пытанні».

Француз па-французску,
Па-польску — паляк
Гавораць з маленства,
А я, мама, як?
Замежную мову
Я ў садзе вучу,
А на беларускай —
Не ўмею, маўчу.
Чаму, адкажы мне,
Ты, тата і дзед

Не размаўлялі
На роднай нідзе?
Я рускую мову
Люблю і вучу.
І нашу таксама
Я ведаць хачу.
Буквар беларускі
Прашу мне купіць,
І родную мову
Пачну я вучыць.

*М. Пазнякоў* [12, с. 72]

**3. Вынік урока**

*Чытанне верша (с. 62).*

— Чым могуць ганарыцца беларусы?

*Настаўнік робіць падагульненне курса беларускай мовы вершам.*

Як песню вясной жаўруковую,
Шануй беларускую мову!
Шануй і любі яе, родную,
Каб мог ты на ёй заспяваць,
Каб мог і зімою халоднаю
Той песняй сяброў саграваць.

*М. Дукса* [10, с. 32]

---

## Літаратура


1. Беларускі фальклор у школе. 2 кл.: дапам. для настаўніка / аўт.-склад.: І. І. Сучкоў, Н. І. Шрамава, У. М. Старчанка. Мн., 2000.
2. Вясёлка : апавяданні, казкі, вершы / склад.: Т. С. Тарасава, М. А. Маляўка. Мінск, 2006.
3. *Драздова, В. Я.* У свеце лікаў і лічбаў : дапам. для настаўнікаў, выхавальнікаў / В. Я. Драздова. Мінск, 1996.
4. Дыдактычны матэрыял па беларускай мове для 1-га кл. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання : дапам. для настаўнікаў / склад.: В. Н. Леановіч, А. Г. Тарасевіч. Мінск, 2000.
5. *Кобец-Філімонава, А. Р.* Вянок дзівосаў : казкі : для дашк. і мал. шк. узросту / А. Р. Кобец-Філімонава. Мінск, 1986.
6. *Ліпскі, У. С.* Азбука жыцця : кн. для дзяцей / У. С. Ліпскі ; маст.: А. А. Доля, Н. А. Хромава. Мінск, 2010.
7. *Ліпскі, У. С.* Пралескі ў небе : аповесці, апавяданні, казкі : для мал. і сярэд. шк. узросту / У. С. Ліпскі. Мінск, 1997.
8. *Лукша, В. А.* Лебядзіная вернасць : выбр. тв. : у 2 кн. Кн. 1 / В. А. Лукша ; маст. В. Александровіч. Мінск, 1997.
9. *Марозаў, З. З.* Азбука агранома Валошкі : кн. для дзяцей / З. З. Марозаў. Мінск, 1999.
10. Мая Айчына : хрэстаматыя / склад.: В. У. Буткевіч, Н. Г. Ваніна, А. У. Талкачова. Мінск, 2005.
11. *Муравейка, І. А.* Куды не пойдзеш — цуды знойдзеш: вершы, апавяданні, казкі, загадкі : для мал. шк. узросту / І. А. Муравейка ; маст. А. П. Пратасеня. Мінск, 2001.
12. *Пазнякоў, М. П.* Тры чарадзеі : вершы, скорагаворкі, загадкі / М. П. Пазнякоў. Мінск, 1991.
13. Примерное календарно-тематическое планирование : пособие для учителей учреждений общего среднего образования с рус. яз. обучения / О. И. Тиринова [и др.]. Минск, 2019.

14. *Солахаў, А. В.* Падарожжа ад А да Я : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. В. Солахаў. Мінск, 2012.
15. Спадчына маёй краіны : матэрыял для азнаямлення дзяцей з гісторыяй і культурай Беларусі : у 2 ч. Ч. 1 / склад. І. К. Грышкевіч. 2-е выд. Мазыр, 2006.
16. *Сторажава, Н. А.* Мова мая і твая: Вучу дзяцей па-беларуску. Мінск, 1993.
17. *Чарняўскі, М. М.* Колькі ў сонейка сяброў! : апавяданні-гумарынкі, вясёлыя вершы, скорагаворкі, лічылкі, загадкі, казкі, песні : для мал. шк. узросту / М. М. Чарняўскі ; маст. У. Жук. Мінск, 2013.
18. *Цвірка, К.* Птушыны хор: вершы і казкі : для мал. шк. узросту / К. Цвірка. Мінск, 1998.

https://multiurok.ru/files/fizkultminutki.html

http://1—4.by/Media/Default/files/Бел. мова 1 кл. Шпиганович! docx

https://sad113mogilev.schools.by/pages/pa-belarusku-geta-guchyts-tak-adzenne-abutak

https://yandex.by/images/search?text=верш

https://karotkizmest.by/беларуская-літаратура/васіль-вітка/васіль-вітка-дзень-нараджэння.html

https://vk.com/topic-95857778_36101660

https://yandex.by/images/search?text=рисунки%20о%20помощи%20детей%20дома&stype=image&lr=155&source=wiz

https://go.mail.ru/search_images?fm=1&q=раскраска%20одежда%20для%20.мальчика%20и%20девочки&frm=web#urlhash=8928017687911218987

https://vk.com/topic-95857778_36101660?post=20820

https://go.mail.ru/search_images?fm=1&q=разукрашки%20погода&frm=web#urlhash=8849534709597873492

https://infourok.ru/fizkulthvilinka-dlya-roka-na-belaruskay-move-3612483.html

http://school39mog.by/nazvy-mesyaca.html

https://www.google.by/search?source=hp&ei=Lwf9Xb_HIOWsmwXq3pOwCw&q=раскраски+цветы&oq

https://www.google.by/search?q=раскраски+профессии+для+малышей

https://yandex.by/images/search?text=Режим%20дня%20школьника%20в%20картинках&source=related-duck&lr=155

http://uchitelskiportvel.blogspot.com/p/blog-page_2.html

## Змест


Прадмова . . . 3

**Раздзел I**
**Вучымся слухаць і вымаўляць**

Урок 1. Наша мова . . . 4
Урок 2. Я і мая школа. Настаўніца і вучні . . . 10
Урок 3. Я і мая школа. Вучэбныя рэчы . . . 16
Урок 4. Я і мая школа. Школьныя памяшканні . . . 21
Урок 5. Я і мая школа. Вучэбныя заняткі . . . 27
Урок 6. Я і мая сям'я. Мае сваякі . . . 31
Урок 7. Я і мая сям'я. Мая кватэра . . . 36
Урок 8. Я і мая сям'я. Рэжым дня . . . 42
Урок 9. Я і мая сям'я. Асабістая гігіена . . . 48
Урок 10. Я і мая сям'я. Адзенне і абутак . . . 57

**Раздзел II**
**Вучымся слухаць і адказваць**

Урок 11. Я і мае сябры. Знаёмімся з сябрамі . . . 62
Урок 12. Я і мае сябры. Гуляем разам . . . 68
Урок 13. Я і мае сябры. Запрашаем на дзень нараджэння . . . 74
Урок 14. Я і мае справы. У доме (хаце) . . . 80
Урок 15. Я і мае справы. На вуліцы (у двары) . . . 85
Урок 16. Я і мае справы. У краме . . . 90
Урок 17. Я і мае справы. На пошце . . . 96
Урок 18. Я і навакольны свет. Надвор'е, з'явы прыроды . . . 102
Урок 19. Я і навакольны свет. Поры года і занятак людзей . . . 109
Урок 20. Я і навакольны свет. Я і жывёльны свет . . . 114
Урок 21. Я і навакольны свет. Я і раслінны свет . . . 121

**Раздзел III**
**Вучымся слухаць, чытаць і адказваць**

Урок 22. Мясціна, дзе я жыву. Мая краіна . . . 128
Урок 23. Мясціна, дзе я жыву. У родным горадзе (вёсцы) . . . 132
Урок 24. Мясціна, дзе я жыву. Наша наваколле . . . 138
Урок 25. Мясціна, дзе я жыву. Славутыя землякі . . . 143
Урок 26. Мясціна, дзе я жыву. Памятныя мясціны . . . 148
Урок 27. Я і мая Радзіма. Сімвалы Беларусі . . . 154
Урок 28. Я і мая Радзіма. Гонар Беларусі . . . 159
Урок 29. Я і мая Радзіма. Святы на Беларусі . . . 165
Урок 30. Я і мая мова . . . 169

Літаратура . . . 174